**Яўген Гарадніцкі,** ***Мастацкі свет беларускай літаратуры XX стагоддзя***, Мінск 2005, сс. 208

Бясспрэчна, што для паўнацэннага развіцця нацыянальнага мастацтва слова з'яўляецца неабходным не толькі выданне размаітых тэкстаў, публікацыя крытычных матэрыялаў, але і патрэба сталага выхаду ў свет прафесійных навуковых прац па літаратуразнаўству, гісторыі і тэорыі літаратуры. Рэцэнзуемая кніга Яўгена Гарадніцкага цалкам адпавядае назве і іміджу выдавецтва "Беларуская навука". Гэта – канцэптуальна новае, аналітычнае даследаванне. Строгая структура класічнай навуковай працы ("Уводзіны", тры раздзелы, "Заключэнне", "Літаратура"), маштабнасць і значнасць комплекса ўзнятых праблем – усё гэта робіць кнігу сур'ёзным дапаможнікам па многіх тэарэтычных пытаннях.

Сам аўтар вызначае асноўную тэму працы як *светапогляд мастака і яго ўяўленні пра мастацтва.* Заўважым, што ў XX ст. дадзеная тэндэнцыя выявілася ў бясконцай тэарэтычнай варыянтнасці і максімальнай дыскусійнай напружанасці. Сістэма, мадэль, мадыфікацыя – гэта толькі частка асноўных паняццяў, якімі аперыруе навукоўца. Асноўным даследчыцкім прынцыпам Я. Гарадніцкі абірае прынцып сістэмнасці, калі пры аналізе аб'ект раскладаецца на структурныя сегменты. Пры гэтым абавязкова вывучаецца вопыт папярэднікаў і апанентаў. Тое, што дадзены прынцып пастаянна вытрымліваецца, бачна ўжо ў назвах раздзелаў і падраздзелаў. Аўтар паслядоўна імкнецца заглыбіцца ў структуру самой мастацкай свядомасці і літаратурнага тэкста, даследавацъ апасродкавана выяўлены пласт ідэй і ўяўленняў. Аналіз вядзецца з улікам спецыфічнасці літаратурнай сітуацыі на Беларусі. Для падтрымкі высноў у сферы паэзіі выкарыстоўваюцца творы класікаў беларускай літаратуры: Янкі Купалы і Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага і Максіма Багдановіч, Максіма Танк і Уладзіміра Жылкі, Аркадзя Куляшова і Міхася Стральцова. Пры аналізе прозы Я. Гарадніцкі звяртаецца да спадчыны Кузьмы Чорнага, Васіля Быкава, Івана Мележа, Віктара Казько, Івана Пташнікава. Відавочна, спектр даследчыцкай увагі надзвычай багаты і сапраўды дазваляе ахапіць значны часавы прамежак даўжынёю ў стагоддзе.

Першы раздзел “Светапогляд як інтэгральны складальнік мастацкай сістэмы” самы кароткі ў кнізе і мае тры падраздзелы. Аўтар слушна і пераканаўча даводзіць сістэмнасць мастацкага свету, разглядае разнастайныя прынцыпы яго дыферынцыяцыі. Найперш удакладняецца само паняцце “мастацкі свет”, яго шматварыянтнасць, у прыватнасці згадваецца “карціна свету”, якая разгортваецца на трох узроўнях: у свядомасці індывідуума, у сферы нацыянальнага менталітэту, у прасторы пэўнай культурна-гістарычный эпохі. Вывучае Гарадніцкі шматзначнаць уласна слова *свет*, трохварыянтнасць яго тэрміналагічных функцый у літаратурна-мастацкім працэсе. Даследчык імкнецца разабрацца ў складанай сістэме мастацкіх мадэляў свету, вылучыць дамінантныя катэгорыі, якія істотна ўплываюць на мастацкую свядомасць. Сутнаснаму аналізу падлягаюць антыноміі: дынамічнае і статычнае, бясконцае і абмежаванае, знешняе і ўнутранае. Дэталёва вывучаецца ў кнізе характар адносін літаратуразнаўства да праблемы “мастацтва – рэчаіснасць”. Падкрэсліваецца важнасць міждысцыплінарных даследаванняў.

Пяць частак наступнага раздзелу “Суб'ектныя і аб'ектныя выяўленні літаратурнага працэсу” ўсебакова асэнсоўваюць абазначаную праблему. Улічваючы тэарэтычную зададзенасць кнігі, натуральна ўспрымаецца той факт, што аўтар багата месца адводзіць на тлумачэнне тэрміналагічнай базы, якая функцыянуе ў тэксце працы. У дадзеным раздзеле даследуецца шырокі спектр празаічных і паэтычных твораў самых розных перыядаў (Я. Купала, М. Багдановіч, М. Танк, І. Пташнікаў і інш.). Разам з тым дасканала прасочваюцца тэндэнцыі ў развіцці сучаснага беларускага літаратуразнаўства. Аўтарам слушна даводзіцца неабходнасць навуковай сацыялагізацыі сучаснай літаратуразнаўчай навукі. Менавіта з такіх даследчыцкіх пазіцый ідзе вывучэнне літаратуры.

Пэўная доля навуковай увагі ў кнізе адводзіцца пытанню міфалагізацыі мастацкага мыслення. Падаецца арыгінальнае тлумачэнне не толькі міфалагем, але і разнастайных лексіка-семантычных адзінак. Як станоўчую рысу дадзенага даследавання трэба адзначыць імкненне і ўменне аўтара пастаянна мець на ўвазе ўвесь гістарычны працэс мастацкага развіцця не толькі ў нацыянальным, але і ў сусветным маштабе. Гэта праяўляецца адносна кожнай аналізуемай з'явы ў любы перыяд. Яшчэ адна вызначальная прыкмета стылю Я. Гараднiцкага – повязь часоў, адчуванне неперарыўнай сувязі і залежнасці многіх наступных працэсаў ад папярэдніх. Таму гаворка нярэдка арганічна пераходзіць ад пачатку стагоддзя да яго завяршэння, і наадварот. Гэта ярка праяўляецца, калі даследчык у адным з падраздзелаў разважае адносна пытанняў мастацкай самарэфлексіі. Нямала аўтарскай увагі адведзена асэнсаванню разнастайных праяў рамантызма і неарамантызма ў беларускай літаратуры XX ст. Такое ж значнае месца адводзіцца пытанням лірыкі і вобразнасці, іх дыхатамічнаму суіснаванню.

Трэці раздзел "Структура свету – структура твора – цэласнаць асобы" складаецца з пяці частак, у якіх развіваюцца і ўдакладняюцца многія палажэнні, заяўленыя яшчэ на пачатку працы. Аўтар шматаспектна разглядае, як два фактары – нацыянальны і сацыяльны – уплывалі на развіццё беларускай літаратуры. Даследчык звяртаецца да спадчыны Якуба Коласа, да яго паэмы "Сымон-музыка". Менавіта ў працэсе аналізу дадзенага твора, а таксама крытычнай літаратуры (Уладзімір Конан, Міхась Тычына і інш.) аўтар асэнсоўвае многія пытанні, усебакова разглядае архетыпы беларускай паэзіі XX стагоддзя.

Рытм, як адзін з істотных фактараў структуры верша, таксама падлягае сур'ёзнай распрацоўцы ў манаграфіі Я. Гараднiцкага. Лірыка Я. Купалы сталася надзвычай прыдатным матэрыялам для такога аналізу. Проза М. Гарэцкага выдатна ілюструе тое, як у літаратуры ў цэлым і творчасці асобнага пісьменніка ў прыватнасці ўзаемадзейнічалі розныя мастацка-творчыя парадыгмы, апрабоўваліся разнастайныя прыёмы і сродкі, зараджаўся новы тып героя.

Я. Гараднiцкі адзін з першых у беларускім літаратуразнаўстве грунтоўна заглыбіўся ў пытанне мастацкага хранатопу, яго існавання і значэння ў тэксце. Дадзеная праблема разглядаецца даследчыкам усебакова, з выкарыстаннем багатага фактаграфічнага матэрыялу. Аналізуючы раманы К. Чорнага, І. Мележа, прозу В. Казько, аўтар манаграфіі прасочае працэс існавання і відазмянення дадзенай катэгорыі – мастацкага хранатопу – на працягу ўсяго прамінулага стагоддзя. Вельмі арганічна і заканамерна ўспрымаецца той факт, што для сцвярджэння ўласных навуковых высноў даследчык карыстаецца ў сваёй працы і празаічнымі, і паэтычнымі творамі. Таму тое, што навуковы дыскурс у кнізе завяршаецца грунтоўным даследаваннем метафізікі пейзажу, бачыцца як лагічны этап працы. Дэталёва асэнсоўваецца семантычная і эмацыянальная сутнасць прыродаапісання. Дынамічнасць, філасафічнасць і полісемантычнасць – адзнакі пейзажу ў беларускай літаратуры.

Захоўваючы і вытрымліваючы ўсе правілы, у заключэнні аўтар манаграфіі падвёў вынікі праробленай працы, выканаўшы гэта ў лаканічнай, максі-

мальна сэнсава напоўненай форме. Варта звярнуць увагу на мову кнігі Я. Гарадніцкага. Яна – яскравы прыклад тых інавацыйных працэсаў, што прэвалююць у сённяшняй навуцы, калі ідзе не толькі насычэнне новымі тэрмінамі і паняццямі, але і кардынальныя змены традыцыйнай лексікі. Гэта прыкмета і адначасова паказчык узроўня сучаснай навуковай працы, прызначанай для акадэмічнага карыстання, аднак, думаецца, не для выдання такога тыпу, разлічанага на дастаткова шырокую аудыторыю. З пастаўленымі даследчыцкімі задачамі Я. Гарадніцкі паспяхова справіўся, унёсшы свой даробак у айчыннае літаратуразнаўства.

*Раманчук Анатоль*
*Гродна*